Шыфр:________________________

Колькасць балаў:________________

Месца:________________________

Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта
намеснік Міністра адукацыі
_____________Р.С. Сідарэнка

«16» сакавіка 2016 года

# ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXXII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Полацк, 2016 г.*

**9 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Варыянт І**

**Заданне 1.** Запішыце словазлучэнні па-беларуску. Падкрэсліце адной лініяй словы (спалучэнні слоў), у якіх шыпячы гук перад свісцячым вымаўляецца як свісцячы; дзвюма лініямі – словы (спалучэнні слоў), у якіх свісцячы гук перад шыпячым вымаўляецца як шыпячы..

*Максімальная колькасць балаў – 5*
(0,5 бала – за кожнае правільна запісанае па-беларуску словазлучэнне,
0,5 бала – за кожнае правільна падкрэсленае слова ці спалучэнне слоў).

1) Песчаные берега речки – ________________________
2) благодарить дочку – ________________________
3) через четыре недели – ________________________
4) радуешься победе – ________________________
5) расшифровать надпись – ________________________

**Заданне 2.** Вызначце, якое агульнае слова-кампанент прапушчана ў наступных фразеалагізмах:

1) *як з … малака*;
2) *… адпушчэння*;
3) *пускаць … у агарод*;
4) *драць …* ;
5) *забіваць …* .

Упішыце фразеалагізмы ў табліцу ў адпаведнасці з прыведзенымі значэннямі.

*Максімальная колькасць балаў – 5*
(1 бал – за кожны правільна ўпісаны ў табліцу фразеалагізм).

| Фразеалагізм | Значэнне |
|---|---|
| | ‘зусім ніякай карысці і пад. ад каго-, чаго-небудзь’ |
| | ‘спяваць кепска, непрыемным голасам’ |
| | ‘гуляць у даміно’ |
| | ‘дапускаць каго-небудзь туды, куды ён імкнецца і дзе ён найбольш небяспечны’ |
| | ‘той, на каго звальваюць чужую віну, адказнасць за другіх’ |

**Заданне 3.** Прачытайце тэкст:

Тлумачэнне значэння слова – раскрыццё, апісанне значэння слова з выкарыстаннем тых ці іншых спосабаў: а) апісанне зместу паняцця; б) падбор сінонімаў; в) падбор антонімаў; г) словаўтваральнае тлумачэнне; д) адсылка да раней растлумачанага слова. Нярэдка пры тлумачэнні значэння слова сумяшчаюцца розныя спосабы (Паводле *«Слоўніка лінгвістычных тэрмінаў»*).

На аснове прыведзенай у тэксце інфармацыі вызначце спосабы тлумачэння значэнняў слоў, упішыце ў табліцу адпаведныя літары (*а*, *б*, *в*, *г*, *д*).

*Максімальная колькасць балаў – 5*
(1 бал – за кожны правільна вызначаны спосаб тлумачэння).

| Тлумачэнне значэння слова | Спосаб тлумачэння |
|---|---|
| Мроі – мары, летуценні. | |
| Кісель – студзяністая вадкая страва. | |
| Лёгенькі – памяншальна-ласкальны да *лёгкі*. | |
| Чытабельны – тое, што і чытэльны. | |
| Гультай – лянівы чалавек; лодар. | |

**Заданне 4.** Прасачыце гісторыю ўтварэння назваў свят і прысвяткаў беларускага народнага календара.

*Максімальная колькасць балаў – 5*
(0,5 бала за кожную правільна вызначаную ўтваральную аснову і 0,5 бала за кожны правільна вызначаны спосаб утварэння).

| Назва | Утваральная аснова | Спосаб словаўтварэння |
|---|---|---|
| Узор: 5.05 – *Ляльнік* | *Лял(я) + нік*(□) | суфіксальны |
| 14.01 – *Васілле* | | |
| 6.04 – *Камаедзіца* | | |
| 4.06 – *Абліваха* | | |
| 14.08 – *Макавей* | | |
| 12.11 – *Праллі* | | |

**Заданне 5.** Вызначце, якія пачуцці выражае выклічнік ***ой!*** у наступных выказваннях.

*Максімальная колькасць балаў – **5*** (1 бал за кожны правільны адказ).

| **Выказванні з выклічнікам “ой”** | **Выражаныя пачуцці** |
|---|---|
| 1. – ***Ой***, Вася! Цішэй ты (*І. Шамякін*). | |
| 2. – Вярнулася-такі! Вырвалася з чартоўскіх кіпцюроў… Зразумела-такі, дзе тваё выратаванне. ***Ой,*** мая ж ты бедная! Мая ты няшчасная! (*Э. Ажэшка*) | |
| 3. – ***Ой,*** мілыя! Як апекаваліся над ім (Дубам)! Як лячылі! – адказала буслам сарока-шчабятуха (*Я. Колас*). | |
| 4. – Нейкі неспакой пачаў агортваць маладое насенне. ***Ой***, ці не жартуе з ім вецер: ці туды нясе ён, куды прасілася душа? (*Я. Колас*) | |
| 5. – Спатканне там назначаеш? – засмяялася Зоська, аж прысела. – ***Ой,*** не магу! Рамантычная прапанова! Каму сказаць – жываты палопаюцца! (*Л. Адамовіч*) | |

**Заданне 6.** Запішыце прозвішчы ў патрэбнай форме.

*Максімальная колькасць балаў – **5*** (1 бал за кожнае правільна напісанае прозвішча).

| **Спалучэнне слоў** | **Правільная форма прозвішча** |
|---|---|
| перад маці і сынам (*Ванькові*ч) | |
| у Льва і Марыі (*Талстой*) | |
| за Харальдам і Нільсам (*Бор*) | |
| пры бацьку і дачцэ (*Ойстрах*) | |
| па Каміле і Вінцэнце (*Дунін-Марцінкевіч*) | |

**Заданне 7.** Гуляем ў СЛОВЫ – у мужчынскія імёны. Правіла вядомае: літара, на якую заканчваецца папярэдняе слова-імя, служыць пачаткам наступнага слова-імя. Па гэтых паказчыках Вы і павінны аднавіць увесь ланцужок беларускіх мужчынскіх імёнаў.

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

**А...........с – С..............н – Н..............р – Р..............р – Р..............н.**

**Заданне 8.** Запішыце ў адпаведных радках па гарызанталі літаратуразнаўчыя тэрміны. *Падказка*: калі Вы ўсё зрабілі правільна, то ў вылучаным слупку будзе прозвішча пісьменніка, якому сёлета споўнілася б 95 гадоў. У яго творчасці быў закладзены пачатак беларускага мастацкага эпасу новага часу. Пасля прачытання аднаго з раманаў гэтага пісьменніка Янка Брыль настолькі быў захоплены і ўражаны, што вырашыў кінуць працу ў выдавецтве і стаць вольным літаратарам, каб ніштo яму не замінала завяршыць свой раман “Птушкі і гнёзды”.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*




1. Разгорнутае, тэматычна адзінае выказванне літаратурнага героя або аўтара, звернутае да іншых асоб або да сябе.

2. Апісанне прыроды ў літаратурным творы.

3. Пункт найвышэйшага напружання ў развіцці дзеяння, сюжэта мастацкага твора.

4. Асноўнае жыццёвае пытанне, якое пісьменнік ставіць у творы, на якое звяртае ўвагу чытач.

5. Сістэма ўзаемазвязаных падзей, паступовае разгортванне якіх раскрывае характары персанажаў і ўвесь змест эпічнага, ліра-эпічнага або драматычнага твора.

**Заданне 9.** Узнавіце з прыведзеных ніжэй прыметнікаў і назоўнікаў назвы твораў беларускай літаратуры са школьнай праграмы і запішыце іх аўтараў.

**Узор:**

| **Назва твора** | **Аўтар** |
|---|---|
| *“Віленскія камунары”* | Максім Гарэцкі |

***Увага!*** Прыметнікі і назоўнікі пададзены ў пачатковай форме, пры ўзнаўленні можа спатрэбіцца змена граматычнай формы. Звярніце ўвагу, што сярод прыметнікаў ёсць “лішнія”, якія не ўваходзяць у прапанаваныя ў заданні назвы твораў.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

**Прыметнікі:** слуцкі, мінскі, ганарысты, незагойны, салодкі, нямоглы, трывожны, пінскі.

**Назоўнікі:** Ткачыха, бацька, Парсюк, яблык, рана, шляхта.

| **Назва твора** | **Аўтар** |
|---|---|
| 1) | |
| 2) | |
| 3) | |

| | |
|---|---|
| 4) | |
| 5) | |
| 6) | |

**Заданне 10.** Прачытайце верш Аляксея Пысіна “Мяркуй, што робіш для душы сваёй…” і запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

Мяркуй, што робіш для душы сваёй –
Шпакоўню, вулей, сціплую кармушку:
Падобны ў чымсьці на пчалу і птушку,
Ты б мог прыйсці ў свет птушкаю, пчалой.

Ты б мог прыйсці бярозкаю, што ссек,
Мурашкаю, што сок з пянёчка выпіла.
Ў істоце той, якою быць не выпала,
Сябе адчуй хоць зрэдку, чалавек!

| | |
|---|---|
| **1**. Тып рыфмоўкі, выкарыстаны паэтам у першай страфе | |
| **2**. Памер, якім напісаны першы радок верша | |
| **3**. Рытарычная фігура, што выкарыстана ў вылучаным курсівам радку | |
| **4**. Выпішыце радкі, у якіх заключаецца ідэя верша. | |